ДОБРЫ ВЕЧАР

1993 ВЕРАСЕНЬ 2 ЧАЦВЕР

№ 165 (600)

Цана 10 рублёў

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ

ЗАСТАЛОСЯ ЗУСІМ НІЧОГА

У Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча дэлегацый Беларусі і Літвы па пытаннях дэлімітацыі граніцы. Падчас перагавораў абмяркоўваліся няўзгодненыя раней участкі граніцы. Бакі згадзіліся з лініяй праходжання граніцы па воднай паверхні азёр Апіварда, Прутас, Гілуціс, Грудас і Дуб, якая была абмеркавана на папярэдняй сустрэчы. Спрэчнае пытанне адносна раёна Парэцкага ваеннага лясгаса даручана разгледзець геадэзічнай і землеўпарадкавальнай службам да 10 верасня.

Удалося дасягнуць згоды практычна па ўсіх участках. Аднак два засталіся няўзгодненымі. У інтэрв'ю карэспандэнту БелаПАН кіраўнік беларускай дэлегацыі, пасол па асобых даручэннях Міністэрства замежных спраў Беларусі Станіслаў Агурцоў сказаў:

— Найбольшыя цяжкасці пры абмеркаванні выклікала лінія праходжання граніцы ў раёне чыгуначнай станцыі Адуцішкіс. У 1979 годзе, згодна з рашэннем міністра шляхоў зносін СССР, гэтая станцыя была перададзена на баланс Віленскага аддзялення Прыбалтыйскай чыгункі. Цяпер беларуская дэлегацыя ставіць пытанне аб вяртанні станцыі. Не менш складаным было вызначэнне лініі праходжання граніцы па воднай паверхні возера Дрысвяты, — працягваў Станіслаў Сяргеевіч. — У 1967 годзе граніца па возеры была перанесена ў бок усходняга берага і, такім чынам, Беларусь страціла значную частку воднай паверхні гэтага возера. Цяпер мы настойваем на аднаўленні граніцы, якая існавала да 1967 года.

Чарговы раунд перагавораў намечана правесці да 15 верасня ў Вільні.

Святлана КУЛІКОВА.

ПРАМЕНЬ НАДЗЕІ Ў РУКАХ ДЗІЦЯЦІ

Своеасаблівы цэнтр псіхалагічнай рэабілітацыі дзяцей, якія пакутуюць ад анкагематалагічных захворванняў, з'явіўся ў Мінску. Ім стаў дзіцячы сад № 207, дзе па ініцыятыве таварыства бацькоў «Дзеці ў бядзе», асацыяцыі «Франсуа ксауе баньо» са Швейцарыі і «Сонца дзецям Чарнобыля» з Заходняй Германіі адкрыта «Школа выжывання» для нездаровых дзяцей.

Дзіцячы сад санаторнага тыпу разлічаны на ўтрыманне 75 дзяцей. У ім працуе і адна кругласутачная група, у якой змогуць лячыцца і адпачываць адразу дзесяць дзяўчынак і хлопчыкаў. У новым садзе ўсё будзе бясплатным — ежа, догляд спецыялістаў, заняткі. Дзеці будуць пад пастаянным наглядам урача-анкагематолага, інструктара па лячэбнай фізкультуры і масажыста.

Прадугледжана праграма і для дзяцей школьнага ўзросту. Заняткі з імі будуць праводзіцца ў форме гульні, індывідуальна з кожным, што дапаможа паскоранай рэабілітацыі дзяцей.

ПРЫЕХАЛІ?..

Становішча з забеспячэннем бензінам у Мінску стала катастрафічным. Учора была перапынена запраўка аператыўных машын міліцыі і хуткай дапамогі.

Як мы паведамлялі ўжо, канфлікт паміж «Мінскаўтазапраўкай» і Белнафтахімам, выкліканы спробай апошняга зрабіць адцужэнне маёмасці «Мінскаўтазапраўкі», працягваецца. Чым і калі ён вырашыцца — аднаму Богу вядома.

А вось чым заканчваецца несвоечасова пададзеная медыцынская дапамога — на жаль, вядома вельмі добра.

☐ **КСТАТИ**

В ГОРОДЕ — кризис с бензином и дизтопливом, а между тем многие хозяйственные субъекты имеют возможность поставлять нефтепродукты в республику. Но получить лицензию на торговлю в Комитете по нефти и химии им крайне трудно. Именно поэтому Мингорисполком 31 августа принял решение выдавать лицензии на розничную торговлю горюче-смазочными материалами на территории Минска. В городе будут выделяться специальные площадки для размещения мобильных заправочных систем. Контроль за выполнением этого решения возложен на Комитет экономики.

«ФОРУМ СВАБОДЫ» Ў МІНСКУ

3 верасня ў Мінску пачынае работу двухдзённы семінар журналістаў, прысвечаны праблемам менеджменту, планавання і маркетынгу ў рэдакцыях перыядычных выданняў, арганізаваны Саюзам журналістаў Беларусі і міжнароднай дабрачыннай арганізацыяй «Форум свабоды».

Журналістыка перажывае цяжкія часы. Многія рэдакцыі аказаліся не падрыхтаванымі да тых эканамічных выпрабаванняў, якія выпалі на іх долю. Саюз журналістаў Беларусі, разумеючы сітуацыю, прыкладае намаганні для таго, каб дапамагчы творчым калектывам не проста выжыць ва ўмовах рынку, але і замацаваць свае пазіцыі.

Сумесна з дабрачыннай грамадскай арганізацыяй «Форум свабоды», якая вядома ва ўсім свеце як мецэнат сродкаў масавай інфармацыі, Саюз арганізаваў другі міжнародны семінар. На ім эксперты Эд Бэйран і Майк Фэлпс з амерыканскага Інстытута прэсы прадставяць удзельнікам праграму, якая з'яўляецца кароткім варыянтам газетнага менеджменту. Курс пад умоўнай назвай «Вывучэнне на прыкладах» плануе выяўленне кола тых тыповых сітуацый, у якіх могуць апынуцца рэдакцыі, і сумесны пошук выйсця з іх. Гэта калектыўная праца калег над вырашэннем праблем, разуменне якіх часам з'яўляецца больш каштоўным, чым канкрэтныя веды і навыкі.

Святлана ЦІВАНАВА.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ — ГЭТА ГУЧЫЦЬ ГАНАРОВА

Як стала вядома карэспандэнту БелаПАН, на пашыраным пасяджэнні савета прадпрыемства аэрапорта «Мінск-2» разглядалася пытанне аб наданні аэрапорту статуса нацыянальнага. На думку выступаўшых, новы статус запатрабуе ад урада большай увагі да авіяпрадпрыемства, дазволіць наладзіць прамыя сувязі з вядучымі авіякампаніямі і аэрапортамі блізкага і далёкага замежжа, павысіць адказнасць за вынікі эканамічнай дзейнасці. І тады, магчыма, авіяпрадпрыемства зможа разлічыцца са сваімі партнёрамі, якім завінавацілі 500 мільёнаў рублёў.

Юрый ГАРЫНЬ.

ИЗ «ИСКРЫ» «ВОЗГОРЕЛСЯ» ПРАЗДНИК!

Проведение «Праздника левой печати» перенесено с первой декады сентября на первую декаду октября.

Как удалось узнать корреспонденту РИДа, это связано с тем, что кроме белорусских изданий принять участие в мероприятии изъявили желание левые газеты России и Украины.

Анатолий ВИТКОВСКИЙ.

☐ **КОРОТКО**

ЛИНИЯ постоянной связи между Министерством обороны Беларуси и таким же ведомством США открылась 31 августа в рамках обеспечения контроля по предотвращению распространения ядерного оружия.

***

ОБЪЯВЛЕН конкурс на создание гимна Минского института культуры. Как стало известно корреспонденту агентства РИД, победителям (композитору и поэту) администрация института обещает премию в сумме 13000 рублей.

ПРИГЛАШАЕТ ДВОРЕЦ

С наступлением нового учебного года Минский Дворец детей и молодежи приглашает юных (не старше 17 лет) заниматься в свои школы, кружки, клубы и секции. Эти многочисленные первичные подразделения МДДМ объединяют отделы: декоративно-прикладного и изобразительного творчества (24 первичных подразделения), спортивного (6), технического творчества (15), художественного творчества (10), массовой работы (9), центр социальной адаптации (8), научный центр «Одаренные дети» (23), а также планетарий МДДМ в парке имени Горького. При таком большом выборе каждый учащийся может выбрать себе интересное занятие. Любители спорта, например, могут заниматься в кружках картинга, мотоспорта, спортивной стрельбы, настольного тенниса, шахматном клубе «Стратег» и клубе «Юный авиатор».

Запись в кружки Дворца — по 10 сентября. Адрес МДДМ — Старовиленский тракт, 41.

Вильям ОСТРИНСКИЙ.

ЯКІЯ ВАШЫ ГАДЫ, БОМЖЫ!

Рэзкі працэс амаладжэння сярод бомжаў назіраюць супрацоўнікі транспартнай міліцыі. Старых бадзяг у прамым і пераносным сэнсе адштурхоўваюць плячом маладыя «калегі», якія не могуць сабе дазволіць капацца ў кантэйнерах са смеццем, збіраць пустыя бутэлькі і г.д. Моладзь ідзе «на дело», але не заўсёды удачна.

З украдзеным тэлевізарам са службовага вагона на станцыі Мінск-Пасажырскі быў затрыманы 27-гадовы бомж.

Яго 26-гадовы калега быў адпраўлены ў ізалятар часовага ўтрымання за крадзеж сумкі ў цягніку «Гродна — Гомель».

Абодва некаторы час будуць мець надзейны дах над галавой.

Віктар ФЕДАРОВІЧ.

ЧАС, НАЗАД!

Савет Міністраў рэспублікі прыняў рашэнне аб пераходзе Беларусі на «зімовы час» — стрэлкі гадзіннікаў пераводзяцца на адну гадзіну назад. Гэта адбудзецца 26 верасня 1993 года ў тры гадзіны.

У афіцыйным дакуменце, падпісаным віцэ-прэм'ерам Мікалаем Косцікавым, гаворыцца, што падставай для такога рашэння стаў артыкул 6 Пагаднення аб супрацоўніцтве па забеспячэнню адзінства вымярэнняў часу і частаты, падпісанага кіраўнікамі ўрадаў-членаў СНД у Бішкеку восенню мінулага года.

АБ ЗАХАВАНЬНІ ГРАМАДЗКАГА АДЗІНСТВА

Супольная заява

Эканамічны і палітычны крызіс, у якім апынулася Беларусь, відавочны: спыняюцца прадпрыемствы, вымушана не працуюць людзі. Кіраўніцтва краіны, выбранае і прызначанае ў часы СССР і панаваньня КПСС, аказалася нездольным праводзіць эканамічныя рэформы і кіраваць новаю незалежнаю дзяржавай. Стары здыскрэдытаваны рэжым стаў на шлях адмаўленьня ад нэўтралітэту, ад прагрэсіўных рэформаў, ад незалежнасьці Беларусі, на шлях супрацоўніцтва з рэакцыйнымі, камуністычнымі, імпэрскімі коламі Расеі. Гэтыя колы зацікаўлены ў тым, каб захаваць у Беларусі расейскія войскі, паласу супрацьпаветранай і супрацьракетнай абароны Масквы, базы стратэгічных і тактычных ракет — фактычна пакінуць Беларусь у стане краіны-заложніцы.

Сутнасьць змовы — у тым, каб, штучна ствараўшы эканамічныя цяжкасьці, прымусіць Беларусь уступіць у сістэму калектыўнай бясьпекі і ў вайсковы саюз з Расеяй, ліквідаваць нашу дзяржаўную незалежнасьць. Выкарыстоўваецца паліўна-энэргетычны шантаж і ствараецца штучны дэфіцыт нафты; адбываецца грубы націск на беларускую фінансава-крэдытную сістэму; арганізуюцца розныя палітычныя акцыі.

У Беларусі ніколі не было міжнацыянальнай варажнечы, і шчасьце наша — у тым, што яе няма і цяпер, у няпростыя крызісныя часы. Але пракамуністычныя, праімпэрскія сілы ня трацяць надзеі справакаваць у Беларусі сутычкі на нацыянальна-моўнай глебе, унесьці ў краіну нестабільнасьць і стварыць такім чынам падставы для замацаваньня таталітарнага імпэрскага рэжыму.

Разьдзімаецца надуманая праблема дзяржаўнага двумоўя. Чарговаю спробаю распаліць напружанасьць стала задума правядзеньня «кангрэсу народаў Беларусі», зь якою выступілі арганізацыі камуністычнага ды імпэрскага кірунку, аб'яднаныя ў «Народное движение Белоруссии». Сама назва мерканага мерапрыемства выклікала абурэньне сваёю правакацыйнасьцю. Бо народ Беларусі — адзіны, ён ня дзеліцца па этнічна-моўных прыкметах; народ Беларусі — гэта ўсе мы разам: і беларусы, і прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў. Нездарма, атрымаўшы адмову з боку арганізацыяў нацыянальных меншасьцяў, ініцыятары мерапрыемства вымушаны былі ўнесьці зьмену ў яго назву (кангрэс не «народаў», а «народа Беларусі»).

Адсутнасць паўнамоцнага прадстаўніцтва ператварае гэтую акцыю ў палітычны фарс. Арганізатары «кангрэсу» нікога, акрамя саміх сябе, не прадстаўляюць, аднак зьбіраюцца прыняць на ім патрабаваньне аб скасаваньні незалежнасьці нашае краіны праз канфэдэрацыю з Расеяй. Але ж сапраўдную думку народу аб будучыні нашай краіны ўжо выказаў прадстаўнічы Зьезд беларусаў сьвету, што нядаўна адбыўся ў Менску.

Уступіўшы ў канфэдэрацыю з Расеяй, Беларусь непазьбежна будзе зацягнута ў бясконцыя і крывавыя войны. Але новыя Афганістаны не патрэбныя ніводнаму жыхару Беларусі.

Мы пярэчым спробам зьнішчыць незалежнасьць нашай краіны і перакрэсьліць надзею на лепшае ў нашага народу. Мы патрабуем спыніць правакацыйныя намаганьні перасварыць людзей Беларусі.

Мы выступаем за незалежную Беларусь, якая мае добрыя дачыненьні з усімі суседнімі краінамі і супрацоўнічае зь імі на двухбаковай аснове. Мы выступаем за Беларусь, дзе будуць гарантаваныя правы чалавека кожнай нацыянальнасьці.

Ад Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне» — Зянон Пазьняк
Ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады — Алег Трусаў
Ад Згуртаваньня беларускіх татар «Аль-Кітаб» — Барыс Шабановіч
Ад Саюзу Палякаў Беларусі — Тадэвуш Гавін
Ад Свабоднага прафсаюзу Беларусі — Генадзь Быкаў
Ад Асацыяцыі ўкраінцаў Беларусі «Ватра» — Багдан Міхайлюк
Ад Беларускай сялянскай партыі — Іван Нікітчанка
Ад Аб'яднаньня беларускіх яўрэйскіх арганізацыяў і суполак — Леанід Левін
Ад Таварыства немцаў Беларусі «Адраджэньне» (Беларускага цэнтру нямецкай культуры) — Аляксандр Майснэр
Ад Беларуска-Літоўскага Задзіночаньня — Ян Войніч
Ад Жаночага хрысьціянска-дэмакратычнага руху Беларусі — Людміла Пеціна
Ад Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» — Ганна Сурмач
Ад Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі — Станіслаў Гусак
Ад Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі — Алесь Апрышка

26 жніўня 1993 г.
г.Менск

КАЛЯНДАР

Чацвер, 2 верасня

СОНЦА — 6.18 / 20.00.
Даўжыня дня — 13.42
МЕСЯЦ — поўня 1 верасня, захад 7.05 / усход 19.37.

ІМЯНІНЫ

Сёння:
Праваслаўныя — Мемнана, Самуіла, Севіра.
Каталіцкія — Вільгельма, Сцяпана.

Заўтра:
Праваслаўныя — Абрама, Васы, Фадзея.
Каталіцкія — Ізабэлы, Рыгора.

■ ПАДЗЕЯ

НАШЫ Ў БОНЕ

Ул. інф. «ДВ».

Учора ў сталіцу Германіі Бон прыбыла афіцыйная дэлегацыя г.Мінска, якую ўзначальвае старшыня Мінгарсавета Аляксандр Герасіменка. Вечарам члены дэлегацыі разам з обер-бургамістрам Бона Хансам Даніэльсам і суправаджаючымі яго асобамі прысутнічалі на канцэрце Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хора Рэспублікі Беларусь імя Г.Цітовіча. Выступленне знакамітага калектыву — гэта толькі пачатак Дзён культуры Мінска, якія, як мы паведамлялі ўжо, праходзяць з 1 па 6 верасня ў рамках фестывалю «Бонскае лета-93». На працягу амаль тыдня сваё мастацтва пакажуць бонскім гледачам вядучыя музычныя, танцавальныя і тэатральныя калектывы беларускай сталіцы, музыканты і спевакі, лаўрэаты многіх міжнародных конкурсаў.

Члены ж афіцыйнай дэлегацыі наведаюць не толькі канцэртныя пляцоўкі, але і правядуць дзелавыя сустрэчы з кіраўніцтвам Бона, пабываюць у гарадах Лінц і Кёльн, абмяркуюць шэраг пытанняў па ўмацаванню далейшага супрацоўніцтва паміж нашымі народамі.

■ ЭХО СОБЫТИЯ

НАТО ПО-ПРЕЖНЕМУ ОСТАЕТСЯ КОЛЛЕКТИВНЫМ, ОБОРОНИТЕЛЬНЫМ СОЮЗОМ

Татьяна ЩЕБЕТ, РИД.

31 августа впервые представители военных организаций Беларуси, Министерства иностранных дел республики и НАТО провели встречу-дискуссию в Минске.

Посол ФРГ в НАТО Германн Фрайхерр фон Рихтхофен, постоянный военный представитель Королевства Нидерланды в военном комитете НАТО, генерал-лейтенант Геррит-Ян Фольмер и представитель международного штаба, заместитель помощника Генерального секретаря НАТО по делам науки и окружающей среды Пауль Рамбант рассказали об изменении функций НАТО после окончания «холодной войны», ответили на вопросы белорусских военных, затрагивающие взаимные интересы Республики Беларусь, СНГ и стран-участниц НАТО в области военно-политических отношений.

Представители НАТО указали, что союз коренным образом изменяется, придерживаясь правила примата политики над военной деятельностью и ориентируясь в своей деятельности на принципы сотрудничества и миротворчества. В области научных разработок, как отметил господин Пауль Рамбант, НАТО перешло на создание программ разоружения, технологий по ликвидации отходов, экологически опасных веществ.

На вопрос о том, видят ли представители НАТО Республику Беларусь в системе коллективной безопасности СНГ, последовал ответ: «Мы не представляем пока четко, каким будет это взаимодействие, и поэтому в рамках СНГ проводим политику сотрудничества с независимыми государствами».

Кроме того, представители НАТО отметили, что, с их точки зрения, присутствие США в Европе — гарант безопасности и общеевропейской целостности. «Мы будем распространять эти зоны стабильности дальше — на восток, чтобы и ваша страна стала частью коллективной безопасности. А пока НАТО остается коллективным, оборонительным союзом», — сказал посол ФРГ в НАТО Германн Фрайхерр фон Рихтхофен.

НА СНИМКЕ: участники минской встречи-дискуссии.

Фото Александра ТОЛОЧКО, БЕЛИНФОРМ.

■ МЫ СТРОИЛИ, СТРОИЛИ...

СПЕКТАКЛЬ У РАЗРЫТОЙ ТРАНШЕИ

Жильцы дома №44 по улице Кальварийской (бывшая Опанского) переживают настоящее бедствие–наводнение.

Елена ЛИТВИН, «ДВ».

На 1,5 м оказались залитыми подвалы здания, в результате чего пришлось отключить электричество.

Возмущенные люди вышли из квартир на улицу, чтобы привлечь внимание к своей беде, позвонили в редакцию газеты.

— Нет больше сил терпеть это безобразие, — выступила вперед Камила Евгеньевна Тихонова. — Уже месяц прошел, как нас начало понемногу заливать. И ничего не сделали, дождались, пока не хлынуло фонтаном. Сидим сутки без электричества, портятся продукты.

Не сырое лето и обильные дожди вызвали катастрофу, и не стихия. Бедствие это — рукотворное, хотя и не преднамеренное. Но разве от этого легче?

Дело в том, что на участке Кальварийской улицы у дома 44 сошлись две стройки: метро и перекладка коммуникаций силами УДМС и Б. Новые трубы еще не проложены, а старые зацепили невзначай. Вот тебе и авария!

— Мы здесь ни при чем! — кипятился начальник УДМС и Б Владимир Куделко. — Мы новые коммуникации прокладываем, старых не касаемся. Тот, кто их проломал — метростроевцы — пусть и восстанавливает. К тому же есть служба, которая их эксплуатирует. Может, мы и опоздали со сроками, но, сами знаете, как сейчас работать: металла нет, бензина нет...

До боли знакомая ситуация — кивнуть друг на друга, спихнуть от себя подальше — особенно такое — канализационное, «с душком» дело. Каждый спешит поскорее «забить» роль без вины виноватого, далее сценарий разыгрывается привычно, нудно и буднично. Как в плохой пьесе. Сплюнули и разошлись. А то и покричать можно, чтобы журналисту «накал страстей» изобразить. А жильцы? Да никуда они не денутся! Это ведь не зрительный зал, из квартир не уйдут.

Вроде, много в городе служб предусмотрено, которые за наш благополучный быт отвечают, и в случае «ЧП» обязаны срочные меры принимать. И Управление коммунального хозяйства, у которого в подчинении Минскводопровод и Минскочиствод, и Минсккоммунтеплосети, и электросети, и аварийная служба Управления жилищного хозяйства. Да и то же УДМС и Б, что оказалось рядом... Но все они остались за кулисами, а в лучшем случае проявили себя суфлерами: это чтобы подсказать, как действовать другим.

Хуже всего, что «ЧП» можно было избежать совсем, когда еще в начале августа труба дала первую течь, прозвучали первые жалобы. Нет! Нам же надо все довести до предела, до обвала, до абсурда. А потом: «Караул! Спасайся, кто может!»

Как пояснил заместитель председателя Фрунзенского райисполкома Леонид Сергеевич Матусевич, аварийная ситуация все-таки спровоцирована УДМС и Б, потому что оно должно по графику заменить коммуникации еще в мае. Метростроевцы же ждать не могут, поэтому вынуждены вести работы рядом с прогнившими трубами хозфекальной канализации. И все же от подобных происшествий никто не застрахован в любом районе города. Главное, чтобы соответствующие службы действовали четко и слаженно, спешили на помощь жителям, а не подставляли друг друга, превращая обычную поломку в трагедию, катастрофу. Здесь, на Кальварийской, силами в первую очередь УДМС и Б, Метростроя и Минскочиствода можно было быстро устранить неполадки и продолжить работу.

Поэтому Мингорисполкому необходимо просто потребовать у подчиненных ему служб выполнения своих прямых обязанностей. Тогда не придется каждый раз выступать в качестве дирижера перед беспомощными "музыкантами" или, бросив все дела, проводить экстренное совещание прямо у траншеи рядом с застывшим экскаватором.

P.S. Электричество в доме подключено. Насосы находятся в состоянии готовности, чтобы откачивать воду при повышении уровня. Ведутся работы по устранению аварии. После пуска участка метро ст. Фрунзенская — ст. Пушкинская (приблизительно года через 2) — дом №44 будет сдан на капитальный ремонт. Специалисты определят уровень шума от движения поездов и дадут рекомендации, насколько снизить его с помощью изоляционных строительных материалов.

По просьбе жильцов райисполком поручил санэпидемстанции определить замер шума от работы оборудования ПО «Минскпроектмебель».

■ СПОРТ-ПАНАРАМА

Іван КАХНОВІЧ, «ДВ».

ТЭНІС

ПЕРШЫ «КРОК» зрабіла Наталля Зверава на Адкрытым першынстве ЗША. Яно стартавала ўжо ў 114-ты раз. На цэментных кортах стадыёна «Флашынг Мэдоў» выступаюць усе мацнейшыя тэнісісты свету, але для некаторых з іх турнір адразу і закончыўся. «Пасеяны» пад шостым нумарам Міхаэль Штіх нечакана прайграў шведу Хенрыку Хольму, а амерыканец Андрэ Агасі (№ 16) — Томасу Энквісту, таксама са Швецыі.

Зверава гуляла з аўстралійскаю тэнісісткаю Элізабет Смайлі. Мінчанка перамагла і цяпер сустрэнецца з пераможцам матча Рэйманд (ЗША) — Феранда (Італія). А вось Ларыса Нейланд-Саўчанка, якая, дарэчы, нядаўна выйграла турнір у Скэнэктадзі, ужо развіталася з мараю аб новай перамозе. Яе саперніца Мануэла Малеева-Франьер са Швейцарыі была мацнейшай. Гэта першая страта сярод тэнісістаў былога СССР. Праўда, у Ларысы засталася магчымасць узяць рэванш у парных спаборніцтвах, дзе яна адзін з фаварытаў. Але галоўны сюрпрыз зрабіла Лейла Месхі, якая «прайшла» таленавітую амерыканку Джэніфер Капрыяці, якую, дарэчы, многія бачылі пераможцай турніру.

СТРАЛЬБА

НЕ ЗАДРЫЖАЛА РУКА ў Анатоля Кліменкі. На фінальных спаборніцтвах Кубка свету ў Мюнхене ён быў першым у стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі. Яго вынік 695 ачкоў.

ВАДНАЛЫЖНЫ СПОРТ

ВАДНАЛЫЖНІКІ НЕ ПАДВЯЛІ. Паспяхова выступілі беларусы на чэмпіянаце Еўропы па водналажнаму спорту. Вольга Паўлава перамагла ў фігурным катанні, трэцяй тут была яе сяброўка Таццяна Канайкіна, і заняла трэцяе месца ў камбінацыі. Алег Дзевятоўскі таксама заваяваў «бронзу» ў камбінацыі.

ФУТБОЛ

Кажуць, і мне гэта падаецца слушным, што песіміст — гэта добра інфармаваны аптыміст, а аптыміст — добра праінструктаваны песіміст. Паўторную гульню гродзенскага «Нёмана» са швейцарскаю камандаю «Лугана» чакалі ў мінорным настроі. Вынік першай сустрэчы — як вы памятаеце, гродзенцы прайгралі з лікам 0:5 — не пакідаў беларусам аніякіх надзей на выратаванне. Што тут хвост распускаць! Ды й, бадай што, і самі футбалісты не верылі ў гэта. На перадматчавай прэс-канферэнцыі галоўны трэнер «Нёмана» Станіслаў Уласевіч сказаў, што ў каманды вялікае жаданне рэабілітавацца ў вачах балельшчыкаў за прыкрую няўдачу ў Швейцарыі, але зразумела, што меў на ўвазе ён канкрэтны вынік мінскага матча, а не двубою ў цэлым. Ды толькі глядзелі на настаўніка гродзенцаў спачувальна, бо нават у гэта амаль ніхто не верыў. Можа, цікава вам будзе даведацца, што толькі адзін швейцарскі журналіст з ліку тых, хто выказаў жаданне прадказаць вынік матча, «аддаў» перамогу «Нёману». Усе астатнія, і нашы, і госці, «паставілі» на «Лугана». Прэзідэнт швейцарскага клуба Франчэска Манзоні, праўда, зрабіў своеасаблівы «камплімент» гродзенцам, калі паведаміў, што ў большай ступені суадносіны сіл сапернікаў не 5:0, а цэлых 3:0, вядома, на карысць «Лугана». Што ж, прыйшлося трэнеру «Нёмана» гэта моўчкі «з'есці» — заслужылі.

Праўда, на маё пытанне адносна пажаданага для «Лугана» выніка мінскай сустрэчы сіньёр Манзоні адказаў сціпла і проста: «Не прайграць».

Цяпер мы ведаем, што футбалісты падвялі свайго прэзідэнта — «Нёман» перамог з лікам 2:1. Хаця, па вялікаму рахунку, гэта нагадала вядомы студэнцкі заклік: «Здамо свае пасрэдныя веды на «добра» і «выдатна». Да вышэйшага балу было, канешне, вельмі далёка. Больш таго, пачатак гульні склаўся так, што ў самы час было збіраць манаткі і рухаць са стадыёна дамоў. Швейцарцы адразу ўзялі ініцыятыву ў свае рукі, і толькі справай часу здавалася рэалізацыя іх перавагі. Зрэшты, так і здарылася. Праўда, дапамог гасцям абаронца «Нёмана» Алег Сысоеў, які так спяшаўся на дапамогу свайму варатару, якога абаронцы пакінулі адзін на адзін высвятляць адносіны з Нестарам Субіатам, што няўдала сустрэўся з мячом, і той уляцеў у вароты гродзенцаў. Здарылася гэта на 29-й хвіліне. І пасля гэтага было яшчэ паўгадзіны беспрасветнай (як дождж, што на ўсю моц «палівау» стадыён) з боку «Нёмана» гульні. А потым цудоўная атака, выхад Сяргея Саладоўнікава сам-насам з варатаром і — 1:1. Тут жа затым прамахваецца Кароза, а яшчэ праз дзве хвіліны ў штрафной госці «валяць» Мазурчыка. Пенальці, але пакрыўджаны б'е міма варот. На 70-й яшчэ адно «прасвятленне». Імклівы праход па праваму флангу Сяргея Гурэнкі, падача, і Юрый Мазурчык у падзенні галавою забівае другі гол. Швейцарцы ўстрапянуліся, мелі некалькі магчымасцей ураўнаваць лік, аднак цяпер шанцавала гродзенцам.

Так, добра, што ўсё менавіта такім чынам скончылася. «Нёману», будзем шчырымі, усміхнулася фартуна. Клас «Лугана», бясспрэчна, вышэйшы і цалкам заслужана швейцарцы па суме дзвюх гульняў «пайшлі» далей. А там іх чакае мадрыдскі «Рэал». Шкада, канешне, што ўвачавідкі мы яго так і не пабачым, але і стрэсаў больш не адчуем ад гульні нашага ўладальніка Кубка.

Бо ў цэлым наш дэбют у еўрапейскіх кубках нагадаў гісторыю пра калгасніка, які пасля грашовай рэформы 1947 года прыехаў у горад з мяшком рублёў, зваліў яго ў куток і пайшоў даведвацца, дзе мяняюць старыя грошы на новыя. Вярнуўся і бачыць — грошы раскіданы па падлозе, а мяшок укралі. Так і мы прадставілі на Еўропу такі ж няякасны тавар. І засталіся без меха.

■ ГЭТА ФАКТ

КАНТРАБАНДЫСТАЎ СТАНЕ МЕНШ

Як стала вядома карэспандэнту БелаПАН, уступіла ў сілу пастанова Савета Міністраў Беларусі аб парадку выдачы дазволу на перамяшчэнне праз граніцу Беларусі прадметаў і рэчаў, небяспечных для жыцця і здароўя. Цяпер юрыдычныя асобы, пасля атрымання ў МУС рэспублікі адпаведнага дазволу, маюць права ажыццяўляць увоз, вываз і транзітныя перавозкі агнястрэльнай, пнеўматычнай, халоднай і газавай зброі, выбуховых рэчываў і прыстасаванняў. Зразумела, для такіх аперацый патрабуюцца сур'ёзныя падставы. На думку спецыялістаў, значная частка дазволаў будзе выдавацца для транзітных перавозак з краін Заходняй Еўропы ў Расію і на Украіну, дзе заканадаўча дазволены гандаль, напрыклад, газавай зброяй. Згодна з прыкладнымі ацэнкамі, да 90 працэнтаў газавых пісталетаў і балончыкаў трапляюць на чорны рынак Беларусі з рук расійскіх і ўкраінскіх бізнесменаў.

Віталь ТРАПЕЗНІКАЎ, БелаПАН.

ПАРТАКТИВ

ЦЕННОСТИ МОЛОДЫХ ЛИБЕРАЛОВ

Андрей ПОТРЕБИН, «ДВ».

Личность и ее свободы, семья, частная собственность — именно такие ценности считают главными молодые люди, учредившие в минувшую субботу союз либералов «Молодая Беларусь».

Среди основателей — студенты, служащие, рабочие в возрасте от 16 до 35 лет (таковы и закрепленные в уставе возрастные рамки). Они собираются широко распространять знания о либерализме, активно содействовать экономическим и политическим реформам, поддерживать становление гражданского общества, заботиться о правах и свободах личности. Любопытно, что среди первоначальных вариантов названия был и такой — либерально-консервативный союз молодежи Беларуси, сокращенно... ЛКСМБ. Естественно, его отвергли, чтобы не повторяться и не вызывать ненужных ассоциаций. Сейчас еще сложно судить — станет союз массовым или оформится как сеть клубов политически активной молодежи.

Теперь молодые либералы займутся подготовкой документов и регистрацией нового общественно-политического объединения в Министерстве юстиции. После этого намечается создание местных организаций, а затем — более представительная конференция для выработки предвыборной стратегии союза и его политической декларации.

«...За долгие годы существования тоталитарной системы сложилась «историческая общность» послушных граждан, которые совсем лишены качеств свободных и цивилизованных людей, — говорится в программном заявлении молодых либералов. — Особенно сильно обрабатывалась молодежь, которой вдолбили в голову коллективизм и отрыв от семьи, безответственность и двойную мораль. Однако победить естественное стремление человека к достойной жизни — невозможно».

— Наше политическое кредо — либерализм, — продолжает объяснять «идейную сущность» 21-летний студент Института иностранных языков Александр СТАРОВОЙТОВ, избранный председателем союза. — Мы признаем прагматизм в политике, свободу личности и семейные ценности — в общественной жизни, частную собственность — в экономике. Мы молоды и желаем построить совсем новую, молодую по порядкам страну, никак не связанную со старым режимом. Поэтому будем всячески способствовать политической и экономической либерализации, кардинальным реформам в Беларуси, переходу к новой внешней политике. Мы выступаем за прекращение вмешательства государства в частную жизнь людей и за резкое уменьшение давления государственного аппарата на экономику.

— Александр, в Беларуси предостаточно как аполитичных молодежных союзов, так и организаций, связанных как с левыми, коммунистическими, так и с национально ориентированными движениями и партиями. Но место, которое собираетесь занять вы, до сих пор, кажется, пустовало?

— Действительно, не хватало именно демократической молодежной организации, центра притяжения для либеральной молодежи. Судя по всему, мы будем довольно радикальны и более последовательны, чем уже существующие партии, заявляющие о своей центристской и либеральной ориентации. Союз обязательно будет выдвигать своих кандидатов и участвовать в выборах. Но вот от слов «борьба, бороться» отказались принципиально — они, как и стоящие обычно за ними методы, не согласуются с идеями либерализма.

Итак, союз либералов «Молодая Беларусь» мечтает о решительном повороте в сторону настоящих рыночных реформ и серьезном обновлении эшелонов власти, которые сплошь заполнены хорошо знакомыми лицами «бывших». А пока молодые либералы открыты для сотрудничества с либеральными, демократическими, демо-христианскими политическими силами и приглашают к себе молодежь соответствующих убеждений. Для интересующихся сразу сообщаем телефоны, по которым можно отыскать новый союз: 46-09-09 и 27-29-12.

ВОПРОС ИЗ КОНВЕРТА

ХОЧУ В ПУТЬ-ДОРОГУ

Подготовила Таиса ХАРТАНОВИЧ.

«Очень прошу вас, — написала нам Инесса, — ответить на мой вопрос: куда необходимо обратиться, чтобы устроиться работать проводником? Есть, наверное, училище, в котором их готовят. Я окончила техникум, мое образование с этой профессией абсолютно не связано, но, может быть, есть возможность трудоустроиться. В нашей организации предстоит сокращение, я стану безработной. Для меня это — выход».

В высшем профессионально-техническом училище железнодорожного транспорта (бывшее ПТУ № 103) интересующая Инессу специальность называется: проводник пассажирских вагонов — кассир билетный. Также в училище на базе 11 классов готовят помощников машинистов, обходчиков, дежурных по станции.

Переучиться на проводника, уже имея образование, как желает Инесса, невозможно. Возможен лишь вариант, когда городской центр занятости, собрав группу желающих получить эту специальность, обращается в ПТУ с просьбой об их подготовке. Так что, если случится, что наша читательница останется без работы, ей, как и всем безработным, необходимо «посетить» центр занятости.

«Мы знаем, что городской Совет принял решение о создании единой очереди в детские учреждения. А вот нашего ребенка в ведомственный сад не принимают», — написала нам семья Григоренко.

Нам ответила начальник отдела дошкольного воспитания Светлана Михайловна Воронина.

— Решение 12 сессии горсовета № 311 от 18.05.93 и Мингорисполкома № 323 от 10.06.93 — шаг гуманный. Прежде всего укреплена материальная база всех дошкольных учреждений из созданного в прошлом году внебюджетного фонда. А это — 1 миллиард 400 миллионов рублей. Распределились эти средства из расчета 15 тысяч рублей на одного воспитанника.

На эти деньги детсады смогли приобрести дополнительные игрушки, ковры, посуду, постельные принадлежности, пылесосы, компьютеры, телевизоры — что кому необходимо.

Использование выделенных средств контролируется финансовыми органами и городской общественной депутатской комиссией.

Этим же решением предусмотрена и ликвидация ведомственных очередей, создание единой очереди по равномерному распределению детей в детсады.

Это дает возможность родителям без лишней волокиты и скитаний по инстанциям определять детей в любое детское учреждение по месту жительства, минуя профкомы предприятий, ведомств.

Из письма в редакцию да и из обращений к нам ясно, что не все руководители предприятий, имеющих детсады, «прониклись» пониманием инициативы депутатов. А ведь зачастую ведомственные сады работают с неполной нагрузкой, меняют режим работы без учета пожеланий родителей. Родители же вынуждены преодолевать «барьеры», чтобы попасть в ближайший детсад. Отныне подобные искусственно создающиеся препятствия — незаконны.

Кстати, эти меры направлены на сохранение и развитие сети детских учреждений, сложившейся системы общественного дошкольного воспитания, которая признана в мире как одна из наиболее прогрессивных.

АКТУАЛЬНА

УЗДЫХНЕ БЕЗ УЗРЫЎЧАТКІ ЗЯМЛЯ-ПАКУТНІЦА

Сапёры Узброеных Сіл Беларусі, якія пачалі з 1 чэрвеня гэтага года суцэльнае размініраванне тэрыторыі рэспублікі, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны ішлі жорсткія баі, працягваюць нарошчваць шматтысячны лік знойдзеных і абясшкоджаных бомб, мін, снарадаў. Пры актыўнай падтрымцы ўрада суверэнная Беларусь пачала рэалізоўваць жыццёва важную праграму, да якой за пасляваеннае паўстагоддзе так і не дайшлі рукі былога магутнага Міністэрства абароны СССР.

Як паведаміў карэспандэнту БЕЛІНФАРМа намеснік начальніка аддзела ўпраўлення Інжынерных войск Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь палкоўнік Сяргей Лучына, толькі ў Дубровенскім раёне Віцебшчыны з пачатку работ знойдзена і абясшкоджана ўжо каля 33-х тысяч выбухованебяспечных прадметаў. Адзначым, што такога «ўраджаю» сапёры не сабралі за мінулы год з усёй тэрыторыі рэспублікі. Для небывала маштабных работ па суцэльнаму размініраванню на дапамогу воінам тэрміновай і кадравай службы прызываюцца спецыялісты з запасу — па 200 чалавек на месяц, змяняючы адзін аднаго групамі. Рашэннем урада рэзервістам выплачваюцца дзве сярэднямесячныя зарплаты па месцы работы за рызыку. Загадам міністра абароны ад 20 мая гэтага года прадугледжана матэрыяльная падтрымка для кадравых сапёраў. Фінансаванне работ па заяўках аблвыканкамаў вядзе Савет Міністраў.

Шкада толькі, што да гэтага часу парламент так і не зацвердзіў пакуль баявых узнагарод і ганаровых званняў з адпаведнымі знакамі адрознення для людзей, якія і праз дзесяцігоддзі пасля другой сусветнай пажынаюць яе смяротна небяспечныя «плады».

Леанід ТРАЦЭЎСКІ, БЕЛІНФАРМ.

МІЛАСЭРНАСЦЬ

ЦІ БЫЦЬ У РЭСПУБЛІЦЫ ЦЭНТРУ ВЫШУКУ?

Цэнтральны Камітэт Таварыства Чырвонага Крыжа Беларусі звярнуўся ў Савет Міністраў рэспублікі з лістом, у якім абгрунтоўваецца неабходнасць стварэння і фінансавання ўласнага рэспубліканскага Цэнтра вышуку. Паводле звестак БелаПАН, адказа пакуль няма. А пытанне наспявае ўсё больш востра. Да гэтага года ўсімі пытаннямі, звязанымі з пошукам пахаванняў у розных краінах свету, займаўся Цэнтр вышуку Саюза Таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. Пасля распаду Саюза гэты орган перайшоў пад юрысдыкцыю Чырвонага Крыжа Расіі, пазбавіўшы астатніх магчымасці карыстацца гэтай інфармацыяй. Да нядаўняга часу паміж Чырвоным Крыжам Беларусі і Расіі існавала дамоўленасць аб супрацоўніцтве ў гэтым плане, але цяпер паўсталі пытанні ўзаемаразлікаў, і практычна ў паветры павісла шмат пошукавых спраў. Частка лістоў вернута, таму што працаваць над імі, магчыма, прыйдзецца і некалькі гадоў. А хто і як будзе плаціць? Аб'ём жа інфармацыі вельмі вялікі. У мінулым годзе, напрыклад, у пошуку было больш за тры тысячы спраў. Вось і ўзнікла неабходнасць стварэння ўласнага Цэнтра вышуку. Пакуль жа ў ЦК ТЧК гэтай працай займаецца адзін чалавек: стварае і апрацоўвае картатэку, вядзе ўсю карэспандэнцыю, рыхтуе адказы на запыты. Ідзе сустрэчны пошук — і, канешне, павялічваецца колькасць зваротаў з іншых краін. Ва ўсіх краінах, дарэчы, гэта работа часткова фінансуецца дзяржавай. А у нас — узяць хоць бы паштовыя паслугі. У сколькі абыйдзецца грамадскай арганізацыі, якой з'яўляецца Таварыства Чырвонага Крыжа, адпраўленне хоць бы сотні лістоў за мяжу, калі і па рэспубліцы адзін канверт 15 рублёў каштуе? А гэтых лістоў не адна сотня...

Міраслава СУЛЬДЗІНА, БелаПАН.

ДЫПЛАМАТЫЧНЫ КУР'ЕР

ЗА ПРАВЫ СУАЙЧЫННІКАЎ

Аляксандр ЛЮШКЕВІЧ, БЕЛІНФАРМ.

